# Гісторыя

*Да 50-годдзя вызвалення Беларусі*
*ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў*

В. К. КІСЯЛЁЎ

## РАЗВЕДВАЛЬНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПАРТЫЗАН БЕЛАРУСІ Ў ІНТАРЭСАХ ФРОНТУ (чэрвень 1941 — ліпень 1944 гг.)

Адной з важнейшых задач партызан на працягу ўсіх трох гадоў акупацыі рэспублікі нямецка-фашысцкімі захопнікамі было атрыманне і перадача камандаванню і штабам савецкіх войск дакладнай інфармацыі аб сілах, сродках і планах вермахта. Разведка ворага праводзілася сіламі спецыяльных разведвальных фарміраванняў, а таксама сувязнымі, удзельнікамі падпольных патрыятычных арганізацый і іншымі савецкімі патрыётамі. Партызанская разведка падраздзялялася на два асноўных віда — вайсковую і агентурную.

У разведвальнай дзейнасці партызан удзельнічалі дзесяткі тысяч патрыётаў. У складзе агентурнай разведкі налічвалася 24 тыс. чалавек, у вайсковай — да 10—15 % асабовага складу партызанскіх атрадаў і брыгад, колькасць сувязных дасягала 19 тыс. У радах падпольных патрыятычных, антыфашысцкіх арганізацый знаходзілася да 70 тыс. чалавек, многія з якіх рэгулярна выконвалі заданні партызан па здабычы інфармацыі аб ворагу[1].

Аб народнай прыродзе і вытоках партызанскай разведкі сведчыць і яе сацыяльны склад. Так, па даным Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР), сярод агентурных разведчыкаў было моладзі, выхаванай у перадваенныя гады (да 26 гадоў), каля 60 % і людзей сярэдняга і старэйшага пакалення — да 40 %; мужчыны складалі каля 2/3, а жанчыны 1/3; рабочых было 32,6 %, калгаснікаў 36,4, служачых і інтэлігенцыі — 31 %[2].

Менавіта масавы і народны характар партызанскай разведкі абумовіў яе вялікую эфектыўнасць. Поспехі разведкі знаходзіліся ў прамой залежнасці ад пашырэння маштабаў партызанскага руху, паляпшэння яго арганізацыі, радыё- і авіясувязі. Калі ў снежні 1941 г. у рэспубліцы дзейнічала 50 партызанскіх атрадаў, то праз год — 365, а ў канцы 1943 г. — 794. У маі 1944 г., нягледзячы на вызваленне Чырвонай Арміяй часткі ўсходніх раёнаў Беларусі, атрадаў налічвалася ўжо 810. У красавіку 1942 г. з'явіліся першыя партызанскія брыгады, якія аб'ядноўвалі па некалькі атрадаў. Праз год іх было 84, а яшчэ праз год — 144[3].

Разам з ростам колькасці і велічыні атрадаў і брыгад развіваўся і ўдасканальваўся разведвальны апарат партызан, няўхільна расла колькасць разведчыкаў. Калі ў 1942 г. у агентурнай разведцы налічвалася больш за 2 тыс. чалавек, дык у 1943 — ужо 8 тыс., а ў 1944 — 14 тыс. Функцыі вайсковай разведкі ў атрадах выконвалі разведвальныя ўзводы, у брыгадах — разведвальныя роты. Да лютага 1943 г. пастаянна дзеючы разведвальны апарат 72-х атрадаў мэтанакіравана займаўся здабычай звестак аб гітлераўцах, ствараў устойлівыя каналы сувязі як непасрэдна з разведчыкамі праз сувязных, так і з пазафрантавымі органамі, камандаваннем і штабамі савецкіх войск. Ужо да ліпеня 1943 г. разведапарат дзейнічаў у 300 атрадах, а ў 1944 — практычна ва ўсіх[4].

Паступова наладжваліся радыё- і авіясувязь. Першыя радыёстанцыі ў партызан з'явіліся вясной—летам 1942 г., да 1 студзеня 1943 г. іх налічвалася 24, а да 1 студзеня 1944 г. — 110, а ўлетку 1944 — 168. Агульная колькасць перададзеных радыёграм з разведвальнымі данымі дасягнула 10 тыс. Захопленыя дакументы праціўніка, найбольш каштоўныя для разведкі палонныя, узоры ваеннай тэхнікі перакідваліся за лінію фронту з дапамогай авіяцыі. Першыя аэрадромы паявіліся

ў партызан летам 1942 г., у жніўні 1943 г. іх дзейнічала ўжо 12, а ў студзені 1944 — 22. Павялічвалася і частата палётаў. Калі за ўвесь 1943 г. іх было выканана нямногім больш за 2 тыс., дык за студзень—чэрвень 1944 г. ужо 4 тыс.[5].

Усё гэта было вынікам упартай арганізацыйна-практычнай работы камандавання партызанскіх сіл на чале з БШПР. Варта адзначыць, што пераважная большасць партызанскіх разведчыкаў, падпольшчыкаў, сувязных былі людзьмі беспартыйнымі, што адпавядала агульнанароднаму характару барацьбы з гітлераўскімі захопнікамі за свабоду і незалежнасць Радзімы, за прадухіленне фізічнага знішчэння большасці насельніцтва акупантамі і ператварэння астатніх у рабоў рэйха. У гэтай барацьбе, у тым ліку і ў разведцы, немалаважную ролю адыгрывалі як радавыя камуністы і камсамольцы, так і іх пярвічныя арганізацыі. Па прыкладных падліках аўтара, у агентурнай разведцы партызан дзейнічала да тысячы камуністаў і трох тысяч камсамольцаў, некалькі тысяч налічвала і вайсковая разведка, у разведапараце атрадаў і брыгад 62 % складалі камуністы і 20 % камсамольцы. Сотні з іх загінулі пры выкананні разведвальных заданняў.

Ужо ў першыя месяцы вайны атрыманыя партызанскай разведкай даныя адыгрывалі значную ролю ў забеспячэнні баявых дзеянняў часцей Чырвонай Арміі. Толькі Глускі партызанскі атрад (Палеская вобл.) з 29 чэрвеня па 2 жніўня 1941 г. правёў на карысць савецкіх войск 300 аперацый па атрыманню інфармацыі аб праціўніку. Асабліва важныя звесткі даставілі разведчыкі К. С. Станкевіч, І. Н. Галамака, М. Н. Камінскі: яны выявілі месца засяроджання варожых войск, размяшчэнне артылерыйскіх пазіцый і складаў боепрыпасаў. У верасні партызанскія разведчыкі Віцебскай вобласці здабылі і перадалі праз свайго сувязнога за лінію фронту звесткі аб сканцэнтраванасці буйных танкавых і авіяцыйных сіл вермахта для наступлення на Маскву і аб арыенціровачных тэрмінах яго пачатку[6].

Глыбокай восенню і зімой 1941 г. і ў пачатку 1942 г. партызаны Беларусі з-за адкочвання лініі фронту далёка на Усход, адсутнасці радыётэхнічных сродкаў і авіяцыі, падвяргаючыся няспынным ударам карнікаў, амаль што страцілі сувязь з пазафрантавымі органамі і не мелі магчымасці рэгулярна і дастаткова поўна даваць ім інфармацыю аб сілах захопнікаў.

Да вясны 1942 г. савецкія войскі ў выніку перамогі ў Маскоўскай бітве выйшлі да ўсходніх граніц Беларусі. Разам з гэтым вясной—летам 1942 г. на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі пачаўся новы, больш шырокі і моцны ўздым партызанскага руху. Аднаўляліся сувязі паміж разведкай партызан і штабамі Чырвонай Арміі. Аднак фашысцкія войскі здолелі спыніць наступленне Чырвонай Арміі на Беларускім напрамку і з вясны 1942 і да восені 1943 г. трымалі тут абарону. Гэтаму садзейнічала тое, што асноўныя сілы Чырвонай Арміі ў той час былі занятыя ў Сталінградскай бітве, абароне і вызваленні Каўказа, у бязлітасных баях на Курскай дузе. Таму аб'ектыўнае становішча на франтах дыктавала і тыя задачы, якія ставіла савецкае камандаванне непасрэдна або праз БШПР перад разведкай беларускіх народных мсціўцаў. Разам з выкананнем гэтых задач вайсковая і агентурная разведкі партызан здабывалі даныя аб войсках, планах і баявой тэхніцы праціўніка і па сваёй ініцыятыве.

У першую чаргу неабходна адзначыць стратэгічныя даныя, якія здолела атрымаць у гэты перыяд разведка партызан. У жніўні 1942 г. народныя мсціўцы Магілёўскай вобласці перадалі ў штаб Заходняга фронту інфармацыю аб перакідцы арміі Манштэйна з-пад Севастопаля ў раён Ленінграда для штурма неўскай цвярдыні. У пачатку верасня 1942 г. штаб Мінскага абласнога злучэння партызан паведаміў савецкаму камандаванню аб здабытых звестках па асноўных палажэннях нямецкага наступальнага плана на восень 1942 г.[7] Гэтыя данясенні разам з іншымі данымі савецкай разведкі адыгралі сваю ролю. Армія Манштэйна была вымушана ўцягнуцца ў цяжкія абарончыя баі з наступаючымі савецкімі войскамі і ёй было ўжо не да штурму Ленінграда. Дакладныя звесткі аб планах гітлераўцаў восенню 1942 г. дазволілі Чырвонай Арміі своечасова перакінуць неабходныя рэзервы да Сталінграда і не дапусціць яго захопу фашысцкімі войскамі.

У пачатку мая 1943 г. вайсковая разведка партызанскай брыгады «Штурмавая» (Мінская вобл.) на падставе аналізу графіка руху варожых эшалонаў да фронту і зместу іх грузаў зрабіла вывад аб узмоцненай перакідцы часцей вермахта, у першую чаргу танкавых, у напрамку Гомеля і іх канцэнтрацыі на ўчастку фронту пад Курскам. 24 мая агентурная разведка

брыгады «За Радзіму» той жа вобласці даведалася аб падрыхтоўцы ў канцы чэрвеня наступлення вермахта на правы фланг нашых войск у раёне Арла—Курска. Разведапаратам брыгады «Разгром» 15 чэрвеня была паспяхова завершана старанна падрыхтаваная аперацыя па вывядзенню і перапраўцы на самалёце ў савецкі тыл буйнога работніка разведвальнага аддзела групы гітлераўскіх армій «Цэнтр» з планамі ліпеньскага наступлення на Курскай дузе і данымі на 500 нацысцкіх агентаў[8]. У выніку савецкія войскі былі загадзя падрыхтаваны і сцягнуты ў раён рашаючага наступлення ворага.

Важнае месца ў ратнай дзейнасці партызан займала разведка аэрадромаў і сістэмы ПВА захопнікаў. Так, у верасні 1942 г. у Віцебскай вобласці партызанамі былі выяўлены і ўзяты пад пастаяннае назіранне 4 аэрадромы ў раёнах Дрэтуні, Полацка, Ідрыцы, Віцебска. Пры гэтым рупліва падлічваліся колькасць самалётаў, іх тыпы, а таксама колькасць лётнага саставу. У чэрвені 1943 г. 8-я Круглянская партызанская брыгада (Магілёўская вобл.) паведаміла аб падземным аэрадроме каля Быхава і спецыяльнай дваццацікіламетровай сакрэтнай зоне вакол яго. Савецкая авіяцыя нанесла па разведаных аэрадромах некалькі раптоўных і дакладных бомбавых удараў[9].

З восені 1943 г. пачынаецца новы, найбольш плённы перыяд работы разведкі партызан у інтарэсах Чырвонай Арміі, якая вяла ўпартыя баі за вызваленне Беларусі. Неабходнасць у пастаяннай, дакладнай і своечасовай разведцы сіл праціўніка ўзрасла шматразова. Асаблівая ўвага звярталася на атрыманне звестак, якія мелі ваенна-стратэгічны характар. У канцы кастрычніка 1943 г. камандаванне Асіповіцкай ваенна-аператыўнай групы (Магілёўская вобл.), якая аб'ядноўвала шэраг брыгад і атрадаў партызан, паведаміла, што разведцы ўдалося здабыць інфармацыю аб сканцэнтраванні ў раёне Жлобіна сямі танкавых і чатырох пяхотных дывізій, якія мелі каля тысячы танкаў. Гітлераўцы планавалі разграміць савецкія войскі ў раёне Жлобіна і Рагачова і, працягваючы контрнаступленне, нанесці ўдары ў фланг Беларускага фронту. Гэтыя даныя былі тэрмінова перададзены ў Стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандавання і дазволілі аператыўна ажыццявіць дзейсныя контрмеры[10].

Да канца мая 1944 г. разведвальны апарат партызанскіх брыгад і атрадаў каля 500 разоў перадаваў звесткі аб перадыслакацыі часцей праціўніка па транспартных камунікацыях. Абагульніўшы даныя за красавік і май аб колькасці эшалонаў і змесце грузаў, якія прайшлі ў напрамку фронту па 14 важнейшых чыгуначных участках, БШПР зрабіў вывад, што фашысцкае камандаванне чакае наступлення савецкіх войск летам 1944 г. на Украіне і не толькі накіроўвае туды свае рэзервы, але і здымае частку сваіх войск з цэнтральнага ўчастка фронту. БШПР інфармаваў генеральны штаб Чырвонай Арміі аб вывадзе на Украіну варожых войск агульнай колькасцю да 25 дывізій[11]. Атрыманыя звесткі ўказвалі на аслабленне групы армій «Цэнтр» да чэрвеня 1944 г., што было ўлічана пры падрыхтоўцы і правядзенні аперацыі «Багратыён».

Адным з важных напрамкаў партызанскай разведкі быў збор і здабыванне інфармацыі аб абарончых збудаваннях гітлераўцаў у Беларусі, якія яны ўзмоцнена ўзводзілі паўтара года (вясна 1942 — восень 1943 г.) і працягвалі ўдасканальваць аж да лета 1944 г. Агульная працягласць абароны ворага дасягала 2200 км і складалася з пяці рубяжоў і ўмацаваных раёнаў. Усе ваенна-будаўнічыя работы, не лічачы сапёрных, захопнікі праводзілі, як правіла, сіламі сагнанага пад пагрозай зброі мясцовага насельніцтва. Таму партызанскае камандаванне накіроўвала на гэтыя работы разведчыкаў пад выглядам будаўнічых і іншых рабочых.

Дзякуючы карпатлівай дзейнасці ўсіх падраздзяленняў партызанскай разведкі былі добра выяўлены і складзены планы варожых умацаванняў па рэках Днепр, Бярэзіна, Сож, Случ, Пціч, Заходні Буг і інш., па Днепра-Бугскаму каналу. Не менш 20 % усёй інфармацыі, якая перадавалася партызанамі за лінію фронту, было звязана са звесткамі аб абарончых умацаваннях гітлераўскіх войск[12]. Пры ажыццяўленні аперацыі «Багратыён» гэтыя даныя дапамаглі савецкім войскам хутка прарваць умацаванні ворага і выратавалі многія тысячы жыццяў нашых салдат і афіцэраў.

Вельмі патрэбныя і каштоўныя звесткі пра ворага здабываліся ў неверагодна цяжкіх умовах, у найвастрэйшым процiборстве са спецслужбамі фашыстаў. Але нішто не спыняла патрыётаў. Яны да канца выконвалі свой абавязак перад Радзімай і народам. Каля шасці тысяч партызанскіх разведчыкаў і сувязных загінула пры выкананні адказных заданняў.

Партызанская разведка, народжаная агульнанароднай барацьбой з захопнікамі і патрыятызмам, здолела паспяхова выканаць пастаўленыя перад ёй задачы па забеспячэнню савецкіх войск патрэбнай інфармацыяй.

[1] 1941 год: трагическое и героическое: Тез. межреспубл. науч. конф. Мн., 1991. С. 138.
[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 3500, воп. 12, спр. 10, арк. 18.
[3] Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны 1941—1944 гг. Мн., 1983. С. 20—21.
[4] НАРБ. Ф. 4, воп. 29, спр. 27, арк. 94, 96; воп. 2, спр. 62, арк. 561—562; ф. 3500, воп. 3, спр. 279, арк. 55; спр. 115, арк. 176.
[5] Там жа. Ф. 3500, воп. 3, спр. 148, арк. 3, 4, 5, 11, 13; спр. 87, арк. 34—36, 41, 75; ф. 4, воп. 33а, спр. 532, арк. 1—10; спр. 601, арк. 78.
[6] Там жа. Воп. 3, спр. 138, арк. 16; Коммунист Белоруссии. 1977. № 7. С. 39.
[7] НАРБ. Мікраплёнка. Інв. № 011, кадр. 18.
[8] Белоруссия в Великой Отечественной войне 1941—1945. Мн., 1990. С. 456; НАРБ. Ф. 4, воп. 33а, спр. 425, арк. 141; ф. 3500, воп. 2, спр. 105, арк. 4, 7-7 об.
[9] НАРБ. Ф. 4, воп. 33а, спр. 425, арк. 113, 260; ф. 3500, воп. 2, спр. 927, арк. 11—17.
[10] Там жа. Ф. 3500, воп. 3, спр. 104, арк. 91; воп. 23, спр. 21, арк. 116; Долготович Б. Д. В едином строю — к единой цели. Мн., 1985. С. 127—128.
[11] НАРБ. Ф. 3500, воп. 3, спр. 67, л. 47; спр. 104, арк. 104; спр. 132, арк. 66.
[12] Там жа. Спр. 67, арк. 43—49; спр. 104, арк. 102—104; спр. 132, арк. 67; Долготович Б. Д. Указ. раб. С. 126.

Н. А. КУТУЗАВА

## З ГІСТОРЫІ ФАРМІРАВАННЯ ПАРТЫЙНАЙ СІСТЭМЫ Ў РАСІІ (1917—1918)

Шматпартыйнасць, што з'яўляецца характэрнай рысай сучаснай палітычнай прасторы, з нядаўняга часу стала рэальнасцю і для нашага грамадства. Яна прымушае сучасных вучоных і палітыкаў рашаць мноства палітычных галаваломак, агульную задачу якіх можна сфармуляваць як пошук аптымальнай мадэлі функцыяніравання грамадства, складанне дзейснай партыйнай сістэмы, адпаведнай умовам соцыуму. Партыйная сістэма, на маю думку, гэта ўзгодненая і адпаведная прававым нормам сукупнасць палітычных партый, якія з'яўляюцца дзейснымі суб'ектамі ўлады. Пачатак фарміравання партыйнай сістэмы ў Расіі можна аднесці да сакавіка 1917 г., калі ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі палітычныя партыі сталі носьбітамі ўлады і ўзялі на сябе ролю арганізатараў новага палітычнага ладу ў краіне.

Першасным пытаннем пры фарміраванні кожнай партыйнай сістэмы з'яўляецца пытанне аб форме і сутнасці той прадстаўнічай сістэмы і адпаведных ёй палітычных інстытутаў, дзе яна будзе функцыяніраваць. У Расіі, якая прайшла праз Лютаўскую рэвалюцыю і разбурэнне традыцыйных інтытутаў самаўладдзя, працэс фарміравання эфектыўнай партыйнай сістэмы стаў у залежнасць ад здольнасці палітычных партый выпрацаваць канструктыўную праграмму рэформ у краіне. У гэтай сувязі асаблівы інтарэс прадстаўляе інстытуцыянальны аспект развіцця партыйнай сістэмы, стварэнне цэнтральных органаў улады і партыйнае прадстаўніцтва ў іх.

Лютаўская рэвалюцыя прывяла да ўлады Часовы ўрад, склад якога да кастрычніка 1917 г. некалькі разоў змяняўся. Найбольш доўгі тэрмін (02.03—05.05.1917) існаваў урад, які быў сфарміраваны на перагаворах прадстаўнікоў Выканкама Петраградскага Савета і Часовага Камітэта Думы і зацверджаны галасамі шасцісот эсэраў і меншавікоў, членаў Петраградскага Савета. Партыйны склад урада быў фактычна аднолькавым са складам Часовага Камітэта Думы, дзе пераважалі кадэты і акцябрысты[1].

Уладарная база трымалася на існаванні двух блокаў: ліберальнага і кансерватыўнага, але Часовы ўрад функцыяніраваў як аднародны, забяспечыўшы гэтым неабходнае адзінства ўлады.

Цікава, што Партыя Народнай Свабоды (кадэты), якая ў сакавіку 1917 г. развівала ідэю адзінства ўлады, унесла ў сваю праграму мадэль парламенцкай прэзідэнцкай рэспублікі: прэзідэнт павінен выбірацца на вызначаны тэрмін парламентам і ажыццяўляць кіраванне выканаўчай уладай пры дапамозе «адказ-